**М. Г. Яленскі, *Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка*,** Мінск 2005, сс. 224

Пытанні моўнай адукацыі ў рэспубліцы заўсёды цікавяць усіх і кожнага: і тых, хто вучыцца і вучыць у школе, і тых, хто вучыцца і вучыць у вышэйшай навучальнай установе, і нават тых, хто не мае непарэднага дачынення да навучання, але якім не ўсё роўна, як вучаць, якія вынікі навучання мове, які ўзровень пісьменнасці, якія навыкі маўленчай дзейнасці набываюць нашы юныя грамадзяне краіны. Да таго ж кожны новы час ставіць новыя задачы перад усімі носьбітамі беларускай мовы і асабліва перад тымі, хто вучыць, і тымі, хто вучыцца, каб стаць настаўнікам беларускай мовы. Ужо толькі гэта вымушае да падрыхтоўкі новых падручнікаў, дапаможнікаў па методыцы выкладання беларускай мовы.

Неабходнасць падрыхтоўкі новых і разнастайных падручнікаў, дапаможнікаў па курсе “Методыка выкладання беларускай мовы ў школе” для філалагічных факультэтаў ВНУ вымагаецца яшчэ абмежаванай колькасцю падручнікаў, дапаможнікаў, метадычных распрацовак па методыцы выкладання беларускай мовы ў параўнанні, напрыклад, з методыкай выкладання рускай мовы. А тыя падручнікі, што ёсць – “Методыка выкладання беларускай мовы” З. Б. Варановіч (Мінск 1985; Мінск 1995) і “Выкладанне беларускай мовы ў школе” (Пад рэд. М. Г. Яленскага, Мінск 1994), проста знікаюць, фізічна старэюць, калі імі бясконца карыстаюцца студэнты, і далёка не ўсё ў іх адпавядае навейшым патрабаванням, сучасным дасягненням навукі, узроўню навучання. Методыка ж выкладання беларускай мовы як навука не стаіць на месцы, яна развіваецца, што абумоўлена пазітыўнымі зменамі ў нашым грамадстве ў апошні час увогуле і ў школе ў прыватнасці, найперш тымі зменамі ў падыходах да навучання, зменамі скіраванасці ад ведацэнтрызму да асобасна арыентаванага навучання і выхавання моўнай асобы на ўроках беларускай мовы.

Усё адзначанае абумовіла актуальнасць вучэбнага дапаможніка М. Г. Яленскага, падрыхтаванага ў адпаведнасці з амаль усімі праграмамі курса “Методыка выкладання беларускай мовы ў сярэдняй школе” для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ, якія дзейнічалі раней і актуальныя зараз (Мінск 1975; Мінск 1997; Мінск 2000), таму што ўсе яны ўключаюць так званыя “Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы”, ці пытанні лінгвадыдактыкі, якія якраз і абраў аўтар зместам свайго дапаможніка.

Падручнік складаецца з 12 тэм, ці раздзелаў, якія прысвечаны асноўным пытанням лінгвадыдактыкі. Не ўсе пытанні асветлены аднолькава поўна і ўсебакова, што абумоўлена рознымі прычынамі: зместам самой праблемы, як, напрыклад, “Асаблівасці вывучэння беларускай мовы ў 11–12 класах сярэдняй агульнаадукацыйнай школы” (210–213 сс.), аб’ёмам пытання, як, напрыклад, “Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках мовы” (214–219 сс.), традыцыйнасцю асвятлення пытання, як, напрыклад, “Сучасны ўрок беларускай мовы: структура і тыпы” і інш. Праўда, тэма “Сучасны ўрок беларускай мовы: структура і тыпы” (161–209 сс.), з’яўляючыся адной з цэнтральных і важных для тэарэтычнага засваення з мэтай далейшай практычнай рэалізацыі магла б быць пашырана. Тут не трэба было баяцца паўтарэння, напрыклад, класіфікацыі ўрокаў, дадзенай у іншых падручніках, а таксама выдзялення і характарыстыкі самых розных структурных кампанентаў урока і асабліва ў залежнасці ад тыпу ўрока, паколькі гэта падручнік для будучых настаўнікаў, якія маюць патрэбу ў рэкамендацыях, накіраваннях для пабудовы ўрока, вызначэння часу і месца адведзенага на ім пэўнага структурнага элемента, нават выбару метадаў і прыёмаў, якія найбольш эфектыўныя, апрабаваныя часам і інш.

Асабліва важна падкрэсліць, што М. Г. Яленскі асвятляе пытанні лінгвадыдактыкі з пазіцый сучасных дасягненняў метадычнай навукі і ўзроўню яе развіцця. Пахвальна і тое, што ў дапаможніку распрацаваны і ўведзены пытанні, якія сталі аб’ектам і вынікам вывучэння методыкі як навукі апошня-

га часу і якія адпавядаюць патрэбам усяго грамадства, сучаснай школы адносна навучання беларускай мове ў прыватнасці. Выключна новым, свежым з'яўляецца раздзел "Лінгвадыдактычная кампаратывістыка", які дае магчымасць у выніку параўнання навучання беларускай мове ў нашай рэспубліцы і мовам у іншых краінах ацаніць на новым узроўні станоўчыя бакі, перавагу моўнай адукацыі на Беларусі, паразважаць і выявіць скрытыя патэнцыяльныя яе магчымасці і разам з тым скарыстаць штосьці з вопыту іншых адукацыйных сістэм.

Цікавасць выклікаюць пытанні аб выдзяленні моўнага ядра асобы вучня, аб нацыянальнай сітуацыі і ўплыве яе на засваенне беларускай мовы, на выбар прынцыпаў навучання.

Цудоўна, што ў дапаможніку маюцца асобныя раздзелы, прысвечаныя выяўленню ўплыву сацыяльнага асяроддзя на вывучэнне беларускай мовы, на фарміраванне моўнага ядра асобы вучня (гл. раздзелы "Аксіялагічныя асновы лінгвадыдактыкі", "Асяроддзе і школа – галоўныя фактары фарміравання моўнага ядра асобы вучня" і вызначэнню мэты і задач моўнай адукацыі, паняццяў 'адукацыйны стандарт', 'змест адукацыі'.

Новыя звесткі нясе дапаможнік аб дзесяцібальнай сістэме ацэнкі і кваліметрычным спосабе вызначэння ўзроўню дзейнасці вучняў, аб асобных новых сродках навучання, што з'явіліся за апошні час.

Аднак хацелася б бачыць больш поўную і стройную сістэму прынцыпаў навучання мове: для навучання важна выдзеліць агульнадыдактычныя, агульнаметадычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы і ахарактарызаваць іх ролю і назначэнне ў практыцы навучання, асабліва з улікам узросту, падзелу вучняў пачатковай школы і базавай ці сярэдняй.

Не выклікае ніякага сумнення, што ўвесь дапаможнік падрыхтаваны з пазіцый выхавання ў будучага спецыяліста сярэдняй школы светапогляду, навуковых асноў арганізацыі навучання беларускай мове. Дапаможнік асвятляе міжпрадметныя сувязі методыкі з педагогікай, псіхалогіяй, логікай і іншымі дысцыплінамі. Зместу кожнага раздзела папярэднічае актуалізацыя ведаў па розных прадметах (на жаль, адсутнічае поўнасцю лінгвістыка), пастаноўка праблемных пытанняў, якія прыцягнуць увагу студэнтаў, выклічуць дыскусіі, актывізуюць мысленне студэнта. Падручнік можа быць скарыстаны для самастойнай працы студэнта, паколькі аўтар у канцы кожнай тэмы прапануе спіс літаратуры для дадатковага азнаямлення.

Вучэбны дапаможнік "Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка" М. Г. Яленскага сёння вітаюць не толькі студэнты філалагічных факультэтаў, якія амаль пазбаўлены падручнікаў па методыцы, але і выкладчыкі розных курсаў і дысцыплін на філалагічных факультэтах, і настаўнікі беларускай мовы сярэдніх школ, гімназій і ліцэяў, для якіх будзе карысным пазнаёміцца з новым асвятленнем многіх пытанняў лінгвадыдактыкі, атрымаць новыя звесткі аб тэарэтычных асновах навучання беларускай мовы ў школе.

*Вольга Ляшчынская*
*Гомель*